НАША ПАМЯЦЬ

# Мужнасць і працавітасць – стрыжань франтавіка-хлебароба

**Пра гэтыя рысы характару не раз узгадваў ветэран Вялікай Айчыннай, былы дырэктар саўгаса «Калінаўка» Адам Дарасінец, калі характарызаваў дзейнасць мясцовага руплівіца Васіля Асовіка, удзельніка партызанскага руху, франтавіка. Мне таксама не аднойчы ў тыя 70-я гады давялося сустракацца з Васілём Міхайлавічам на партыйных нарадах, злётах пераможцаў сельгасвытворчасці, мерапрыемствах па абмене вопытам.**



Слаўны шлях прайшоў уражэнец Калінаўкі Васіль АСОВІК.



Наш зямляк з таварышам-вайскоўцам.

Ён нарадзіўся ў 1921 годзе ў Калінаўцы. З малых гадоў спазнаў сялянскую справу. У 18-гадовым узросце Васіль ажаніўся з мясцовай дзяўчынай Параскай. Неўзабаве ў маладой сям'і адбылося прыбаўленне: нарадзілася дачушка, і турбот, канешне, прыбавілася. Але дбайны вясковец усюды паспяваў. Прытым і за плугам на калгасных палетках з ім мала хто мог пацягацца, і на касьбе ішоў уперадзе, кладучы траву ў роўныя пракосы. Заўзята шчыраваў на зямлі, клапаціўся пра дабрабыт дамачадцаў. А ў 1940-м атрымаў позву, і без усялякіх разваг ён накіраваўся на службу ў Чырвоную Армію.

З настойлівасцю і зацікаўленасцю Васіль Асовік асвойваў азы салдацкай навукі. І ў думках уяўляў, як хутка ізноў вернецца дадому. Ды фашысцкая навала скасавала планы маладога чырвонаармейца. Варожыя танкавыя часці клінам рваліся ў бок Мінска. Часць трапіла ў акружэнне. З баямі па лясістых балотных сцежках вырваўся з аблогі. Знясілены пасля цяжкіх пераходаў, усё ж такі дабраўся да роднай вёскі. А крыху акрыяўшы, пачаў разважаць, як жыць далей...

У 1942-м у сям'і з'явілася яшчэ адна дачушка. Гледзячы на сваіх дзяўчынак – любых крывінак, вясковец усё больш упэўніваўся, што трэба супрацьстаяць ворагу, каб не жыць у няволі. І калі пачалі арганізоўвацца партызанскія атрады, ён адразу ж стаў байцом аднаго з іх – імя Кутузава, брыгады №25 імя Панамарэнкі, штаб якой базіраваўся на востраве Зыславе.

У час баёў, засад Васіль праяўляў смеласць і рашучасць. У «Хроніцы гісторыі Любаншчыны» ўзгадваецца, што ў сакавіку 1944-га атрадам брыгады №25 была пастаўлена задача знішчыць чыгуначнае палатно Старушкі – Урэчча, але прымяняць узрыўчатку забаранялася. З 7 гадзін раніцы 11 сакавіка на працягу трох дзён байцы (у іх ліку і Асовік) уручную з дапамогай ключоў, ламоў пад агнём фашысцкай артылерыі адрывалі рэйкі ад шпалаў, перасякалі іх, перакопвалі насып. Такім чынам было выведзена са строю 15 км чыгункі...

Пасля вызвалення раёна Васіль пайшоў на фронт і працягваў змагацца з карнікамі ў складзе 1026 стралковага палка 26 стралковай дывізіі 47 арміі І Беларускага фронту. У баях вызначаўся дысцыплінаванасцю, адказнасцю, уменнем спрытна прыводзіць у дзеянне механізм гарматы. Наводчык дасканала і своечасова вызначаў накірунак ударaў па ворагу.

**Так, 30 студзеня 1945 года ў баях на тэрыторыі Польшчы знішчыў тры агнявыя пункты праціўніка, дзесяць фашыстаў, што дапамагло нашым падраздзяленням утрымаць заняты рубеж. А Васіль Асовік за гэта быў узнагароджаны медалём «За адвагу».**

Вызначыўся наш зямляк і падчас баёў за авалоданне населеным пунктам Гізэнталь. Наступленню перашкаджаў агонь варожых кулямётаў. Васіль жа сваёй гарматай разбіў кулямётную кропку немцаў, чым дапамог выкананню баявой задачы. І загадам камандавання быў адзначаны ордэнам Славы III ступені.

А 12 сакавіка1945-га ў баі на Шцэцінскім накірунку ў раёне населенага пункта Хэкендорф гармата Асовіка прамой наводкаю расстраляла некалькі дзясяткаў фашысцкіх салдат і кулямётную кропку праціўніка, 17-га ў баі за вышыню Цэбельс разбіла дзот ворага. За што адважны баец атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі.

Баявы шлях салдата Савецкай Арміі закончыўся на Эльбе. Амаль год ён яшчэ дапамагаў мясцовым жыхарам наводзіць парадак на вызваленых ад нацыстаў тэрыторыях, усталёўваць мірнае жыццё. А калі вярнуўся ў 1946 годзе на малую радзіму, на гімнасцёрцы вызваліцеля ззялі шматлікія ўзнагароды.

Паводле ўспамінаў родзічаў і аднавяскоўцаў, кіраўніцтва гаспадаркі прызначыла Васіля Асовіка брыгадзірам паляводчай брыгады. А на чарговым сходзе калгаснікі выказалі яму давер і абралі старшынёй «Чырвонай Арэсы». Усе свае сілы, уменне, жыццёвы вопыт былы франтавік накіраваў на аднаўленне калгаснай вытворчасці. Патрабаваў ад сябе і кожнага працаўніка самаадданасці пры вырашэнні пастаўленых задач. Разам пераадольвалі цяжкасці ў асваенні тэхналогіі вырошчвання незнаёмай працаёмкай культуры – кок-сагызу.

Арганізатарскія здольнасці, уменне згуртаваць і павесці за сабою калектыў на выкананне планаў і сацыялістычных абавязацельстваў заўважылі ў партыйных органах. Асовік атрымаў прапанову паехаць на вучобу ў школу старшынь калгасаў, якую паспяхова закончыў старшыня калгаса «Чырвоная змена» Кузьма Шаплыка. Аднак сямейныя абставіны, недастатковая даваенная адукацыя не дазволілі Васілю Міхайлавічу зрабіць такі адказны крок. У 1950-м, калі ўсе калгасы на тэрыторыі Малагарадзяціцкага сельсавета аб'ядналіся ў адзіны – «Дружба», ён пачаў выконваць абавязкі намесніка старшыні. Увогуле ўся прафесійная біяграфія Асовіка была звязана з сельскай гаспадаркай. На заслужаны адпачынак яго праводзілі з саўгаса «Калінаўка».

**–Ён любіў працаваць на зямлі, да справы адносіўся адказна. Гаспадарыў дбайна, руліва і распараджэнні даваў прадуманыя, узважаныя, эканамічна пралічаныя, каб атрымаць эфектыўны вынік, – так пра Васіля Асовіка гаварылі аднавяскоўцы.**



Яскравае пацвярджэнне адвагі і мужнасці.



У баявой біяграфіі Асовіка ёсць і партызанская старонка.

Нездарма прафесійны шлях франтавіка адзначаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, бронзавым медалём «За поспехі ў народнай гаспадарцы СССР», знакамі «Пераможца спаборніцтва», «Ударнік пяцігодкі», шматлікімі дыпломамі, граматамі, каштоўнымі падарункамі мясцовых органаў улады.

Не стала Васіля Міхайлавіча ў 1990 годзе. Але памяць пра яго жывая і кранае сэрцы родных, землякоў. А годнае жыццё ветэрана служыць ім ды і ўсім нам наказам: пад Чырвоным Сцягам Перамогі ўпэўнена крочыць у будучыню.

**Анатоль ВЯЛІЧКА,
член КПБ,
настаўнік
Сароцкай СШ.**